## № 62. [Уладзімеру Дубоўку]

*[Зіма 1931 — 1932]*

Даўно ўжо дакляраваў я табе напісаць пра „Штурмуйце будучыны аванпосты!“, ды ўсё неяк аж да гэтага часу не ўдавалася мне гэта зрабіць. Прызнацца, нататкі ўражаньняў ад гэтага твору, якія ён зрабіў гэтым летам на мяне, у мяне ўжо даўно былі зроблены, але мне не хацелася пасылаць іх да цябе ў тым выглядзе бясформнае масы, у якім яны зьявіліся перада мною. Мне ўсё хацелася, каб яны, так–бы сказаць, адстояліся і аформіліся. Але для гэтага патрэбен быў час, і час ня звычайны, а вольны ад турбот і клапот. Гэтага–ж якраз гэтым годам у мяне вельмі а вельмі мала даставала. І ўсё з–за таго, што знайшло сваё первястковае, яшчэ я–б сказаў, нявыразнае назначэньне вобразам „Дон Пуза“ ў „Штурм[уйце] будучыны аванпосты!“. Больш за ўсё займала мяне гэтым часам гэтая ўява Комбайна, як яна сказала сябе ня ў гэтым творы, а ў рэчаіснасьці найшла на мяне і ўвабрала паволі амаль усяго мяне і маю сям'ю ў сябе. То–ж мне ўяўляецца гэты час у вобразе гэтага „Пуза“, якое разраслося да таго, што ўвабрала ў сябе і галаву з яе і мазгамі і думкамі, не таму, каб бліжэй да іх наедак зрабіць, а таму, каб яны былі бліжэй да „наедку“ і яму служылі. Як ніколі перада мною паўстала ўся веліч гэтага, толькі шчэ назначанага ў саркастычных, я–б сказаў, абрысах вобраза Дон Пуза ў „Штурмуйце будуч[ыны] аванпосты!“. Гэта што той Мамона, які прымусіў сабе служыць цэлыя народы. Але пра яго думаю яшчэ пагутарыць асобна. Тут–жа я хачу толькі адзначыць, што гэты „Дон Пуза“, у выглядзе звычайных штодзённых турбот і клопатаў аб пражытку, адбіраў у мяне ўвесь мой час. Калі, часам, і аставалася якая капля яго вольнаю, дык і то яна была атручана ягоным паветрам, і ані дзела, ані работы вольнай мысьлі яна не давала. Калі што й думалася такімі часінамі, дык гэта толькі як высновы з гэтага стану — калі хочаш, каб чалавек ня меў вольных думак, зрабі яго нявольнікам Дон Пуза, аддай яго ў няволю да гэтага пана, і будзеш тады ты спакойны ад усякай „крамолы“, — Дон Пуза ўжо паклапоціцца аб тым, каб і тхнуць яму ня было калі, ня то шчэ аб чым–небудзь вольна думаць. То–ж бо, сказана ў чалавечых пісаньнях, пэўнаму палажэньню ўласьцівы пэўныя і думы. Ото–ж і палажы ты чалавека ў Дон Пуз[авы] улоньні, калі хочаш, каб думаў ён, як уласьціва гэта гэтаму палажэньню! Ды як прыслухаўся я да гэтага голасу, то лягчэй на сэрцы і ў думках весялей стала — то голас быў вольных хвілін, вольных ад донпузавых палажэньняў.

## № 63. Антону Адамовічу

*25.12.31*
*Слабадской.*

Дарагі браце Антось!

„Нядоля Заблоцкіх“ сваім пачаткам абяцае быць вялікім творам, ня толькі ў памеры, але й сваім значэньнем. Уражаньням ад выдрукаванага пачатку гэтага твору і думкамі пра яго я даўно ўжо зьбіраўся пасьвяціць асобны ліст да цябе. Ды замарудзіўся я з ім аж да таго, што дачакаўся ад цябе ня толькі ліста з дзьвюма яго папярэдніцамі–паштоўкамі, але і трывожнае лістоўкі пасьля яго. Ізноў нашы думкі спаткаліся.

Усяму таму, што ты паведамляеш у сваім лісьце і лістоўках, я вельмі рад. Твае думкі — гэта іскры таго сапраўднага жыцьця на ўздальлі нашым, якое пустэльню нашага выгнаньня ператварае ў ааз творчае мысьлі. І ці тое, што ты перадумаў пра